# АБ УДАСКАНАЛЕННІ ЛІНГВАМЕТАДЫЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ ПРАЗ ФІЛІЯЛ КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАГА І РУСКАГА МОВАЗНАЎСТВА

*Качан В.Г., кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск,*
*Ивакина А.Н.,*
*ГУА «Сярэдняя школа № 153 г. Мінска», г. Мінск.*

Анатацыя. Артыкул прсвечаны пытанням інтэграцыі рэсурсаў філіяла кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі ў вучэбную дзейнасць студэнтаў, праблемам фарміравання іх камунікатыўнай кампетэнцыі, рэалізацыі кагнітыўна-камунікатыўнага падыходу да вывучэння моўных адзінак.

*Ключавыя словы: філіял кафедры, камунікатыўная кампетэнцыя, маўленча-камунікатыўныя уменні і навыкі, прафесійны імідж.*

Для настаўніка валоданне правільным, дакладным, багатым, разнастайным маўленнем з’яўляецца нед’емнай часткай прафесійнага іміджу. Для настаўніка пачатковых класаў гэта бездакорнае валоданне абедзвюма мовамі – рускай і беларускай. Як арганізаваць навучанне мовам, каб яно дазволіла студэнту – будучаму настаўніку пачатковых класаў – стаць сапраўдным білінгвам, быць запатрабаваным на рынку працы, сфарміраваць прафесійныя маўленча-камунікатыўныя ўменні і навыкі з мэтай свабоднага карыстання дзяржаўнымі мовамі ва ўсіх сферах прафесійнай дзейнасці? Засвоіўшы праграмны моўны матэрыял, выпрацаўшы маўленчыя навыкі, студэнт не мае дастатковых магчымасцей пастаянна, паслядоўна рэалізаваць засвоены матэрыял ва ўмовах, набліжаных да рэальнай прафесійнай сітуацыі і па сутнасці, сфарміраваць трывалыя маўленчыя ўменні і навыкі, у поўнай меры развіць свае творчыя здольнасці, павысіць матывацыю, зацікаўленасць у навучанні, замацаваць у свядомасці карыснасць фарміруемых кампетэнцый.

Арганізаваць вучэбную дзейнасць студэнтаў факультэта пачатковай адукацыі, дапамагчы ім у час гэтай дзейнасці, выступіць у якасці дарадчыка (не правяраючага!) дазваляе філіял кафедры беларускага і рускага мовазнаўства, адкрыты на базе ДУА «Сярэдняя школа № 153 г. Мінска».

У Дагаворы аб супрацоўніцтве за нумарам 27-01/2016 адзначаецца, што «прадметам Дагавора з’яўляецца супрацоўніцтва філіяла кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ і Школы для дасягнення агульных мэт падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, развіцця навуковых даследаванняў у галіне мовазнаўства і лінгвадыдактыкі». Філіял кафедры плануе і арганізуе вучэбную, метадычную, навуковую і выхаваўчую дзейнасць, узмацняе практычную накіраванасць адукацыйнага працэсу, дазваляе рэалізаваць кагнітыўна-камунікатыўны падыход да вывучэння моўных адзінак,

дае магчымасць студэнтам аваловаць мовай у рэальным яе функцыянаванні, выкарыстоўваць моўныя сродкі ў вербалізацыі сваіх педагагічных намераў, у передачы ведаў вучням, выразна фармуляваць і дасягаць мэт камунікацыі ў прафесійным асяроддзі. Студэнты могуць не толькі ажыццяўляць выбар моўных і маўленчых сродкаў, адэкватных мэтам і задачам урока, але і звязваць, афармляць, «трансформировать смысловое, композиционно-структурное, лексико-грамматическое, тема-рематическое содержание высказывания, и при этом будущий педагог должен не только контролировать процесс реализации им задуманного, но и наблюдать за реакцией аудитории (и реагировать на неё!), обеспечивать активное включение поступающей информации в память слушающих, максимальную концентарацию внимания аудитории на выделенном существенном» (1, 112).

У ходзе правядзення студэнтамі факультэта адкрытых аўтарскіх урокаў па літаратурным чытанні для навучэнцаў пачатковых класаў ДУА «Сярэдняя школа № 153 г. Мінска» («Падарожжа па літаратурнай краіне Уладзіміра Мазго» ў межах праекта «Ад культуры чытання да культуры асобы») для вучняў 4 класа, урокаў пазакласнага чытання («Я тут жыву» па матэрыялах часопіса «Вясёлка») для навучэнцаў 2 – 3 класаў, факультатыўных заняткаў па беларускай мове «Роднае слова» для 1 класа выразна акрэсліліся патрабаванні да спецыяльных ведаў, асобасных якасцей сучаснага спецыяліста. У час распрацоўкі сцэнарыяў і правядзення інтэлектуальных гульняў («Чароўная скарбоначка» для вучняў 2 – 4 класаў) з выкарыстаннем відэаматэрыялаў раскрыліся індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці кожнага студэнта: маўленчая аўдытыўная памяць, маўленчая аўдытыўная ўвага, маўленчая аўдытыўная вынослівасць, якія напрамую ўплываюць на ўспрыняцце і разуменне маўлення.

Філіял кафедры дае магчымасць студэнтам з галавой акунуцца ў школьнае жыццё. На аснове сістэматычнага наведвання школы і падтрымання зносін са школьнікамі ў будучых настаўнікаў фарміруецца трывалая матывацыя педагагічнай дзейнасці. Студэнты вучацца быць прафесіяналамі на ўсіх узроўнях падтрымання зносін з вучнямі: камунікатыўным, інтэрактыўным, перцэптыўным, што дазваляе стварыць на ўроку атмасферу ўзаемаразумення, улічыць асобасныя характарыстыкі вучняў, навучыцца «чытаць» іх настрой і разумець псіхалагічныя эфекты ўспрымання вучэбнага моўнага матэрыялу.

Удасканальваць навыкі аўдзіравання, маналагічнага і дыялагічнага выказвання дапамагае ўдзел студэнтаў у падрыхтоўцы і правядзенні прадметных тыдняў па беларускай мове ў межах дэкады «Вандраванне па краіне ведаў», у абмеркаванні школьных праектаў («Школа любознательных детей. Познание. Открытие. Исследование. Совершенствование. Креатив»), арганіза-

цыі навукова-практычных канферэнцый, у распрацоўцы вучнёўскіх рэфератаў, навуковых дакладаў, алімпіядных заданняў па рускай і беларускай мовах.

Будучыя настаўнікі маюць магчымаць пазнаёміцца з матэрыяламі даследаванняў, якія праводзяцца сумесна выкладчыкамі кафедры, настаўнікамі пачатковых класаў і школьным псіхолагам. Удзельнікі навукова-даследчай лабараторыі «Ад слова да фразавага маўлення», адкрытай пры філіяле кафедры, займаюцца распрацоўкай актуальных пытанняў сучаснай лінгваметодыкі, сярод іх і праблемы навучання арфаграфіі малодшых школьнікаў, і праблемы выкладання беларускай мовы ў школах з рускай мовай навучання, пытанні фарміравання моўнай сістэмы навучэнца-білінгва I ступені атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ва ўмовах блізкароднаснага рускабеларускага двухмоўя. Студэнты старшых курсаў прымалі актыўны ўдзел у складанні картатэкі тыповых маўленчых памылак навучэнцаў 2–4 класаў, што, безумоўна, спрыяла развіццю моўнай пільнасці, увагі і павагі да слова, фарміраванню ўменняў маўленчага ўзаемадзеяння, а маўленчае ўзаемадзеянне, як вядома, з’яўляецца важнай умовай арганізацыі вучэбнай работы на ўроку, актывізуе маўленчамысліцельную дзейнасць.

Асабліва важна і вельмі цікава выкарыстоўваць базу філіяла кафедры як эксперыментальную пляцоўку для апрабацыі матэрыялаў студэнцкіх курсавых і дыпломных работ. На базе школы было праведзена анкеціраванне настаўнікаў 2–4 класаў і бацькоў малодшых школьнікаў на прадмет актуальнасці выдання «Даведніка па літаратурным чытанні для 2 – 4 класаў», падрыхтаванага студэнтамі факультэта пачатковай адукацыі – удзельнікамі студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі «Слова ў сістэме працы па развіцці маўлення малодшых школьнікаў» (грант Міністэрства адукацыі РБ на выкананне навуковых даследаванняў аспірантамі, магістрантамі, студэнтамі).

На базе філіяла кафедры беларускага і рускага мовазнаўства штогод праходзяць практыку студэнты дзённай формы навучання. Кіраўнікамі практыкі з’яўляюцца лепшыя настаўнікі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, па выніках практыкі арганізуецца круглы стол, на якім мае магчымасць выступіць кожны студэнт. Нашы студэнты могуць ўдзельнічаць у семінарах, вебінарах, якія праводзяцца філіяламі кафедраў факультэта пачатковай адукацыі.

На базе філіяла кафедры пастаянна праводзяцца прафарыентацыйныя мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне матывацыі ў навучэнцаў старшых класаў да навучання ў БДПУ. З удзелам навучэнцаў 9 – 11 класаў школы праходзяць навукова-практычныя канферэнцыі і адкрытыя навуковыя чытанні на факультэце пачатковай адукацыі. У школе створана педгрупа, выпускнікі якой з’яўляюцца студэнтамі БДПУ, у тым ліку, факультэта пачатковай адукацыі.

У дапамогу маладым настаўнікам на філіяле кафедры створана метадычная бібліятэка, якая сабрана з навукова-метадычных распрацовак і прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры, і настаўнікаў школы.

Нягледзячы на тое, што сёння прыведзены ў адпаведнасць дасканалыя навуковыя веды пра мову і школьная практыка, метадычныя прынцыпы і прыёмы выкладання мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, што садзейнічаюць актывізацыі і прадуктыўнасці самога працэсу навучання, пашыраны тэхнічныя магчымасці, даступныя для школы, напісаны новыя праграмы, падручнікі, распрацаваны новыя тыпы ўрокаў, удакладнена сістэма навучальных заданняў, праблемы прафесійнай падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых класаў застаюцца актуальнымі ў аспекце фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі, якая ўключае ў сябе валоданне правіламі камунікатыўнай граматыкі, граматыкі выкарыстання моўных адзінак, камунікатыўнымі формамі сказа, правіламі транспазіцыі і канструявання структуры выказвання. Выкарыстоўваючы рэсурсы філіяла кафедры, правільна інтэгруючы іх у вучэбны працэс, можна больш эфектыўна рашаць цэлы шэраг дыдактычных задач. Філіял кафедры дае ўнікальную магчымасць студэнтам стаць сапраўдным педагогам, білінгвам, метадыстам, арганізатарам-выхавацелем.

**Спіс літаратуры**

1. Седов, К. Ф. Дискурс и личность / К. Ф. Седов. – М. : Лабиринт, 2004. – 320 с.

# ВОСПРИЯТИЕ ЯЗЫКА И УСВОЕНИЕ НАЦИОНАЛЬНЫХ ТРАДИЦИЙ ПОСРЕДСТВОМ НЕТРАДИЦИОННЫХ ФОРМ ПРОВЕДЕНИЯ УРОКОВ

*Качан О.Г., кандидат филологических наук, доцент,*
*Белорусский государственный педагогический университет*
*имени Максима Танка, г. Минск,*
*Семак А.Т.,*
*ГУО «Гимназия № 5 г. Минска», г. Минск*

Аннотация. Статья посвящена вопросам реализации нетрадиционных форм проведения уроков русского языка в начальных классах. Акцентируется внимание на том, что музейный урок может быть использован и как способ восприятия языка, и как средство усвоения национальных традиций.

*Ключевые слова: музейный урок, лингвокультурологический подход, познавательная деятельность, национальная культура.*

При подготовке к уроку учитель каждый раз решает целый ряд задач. Как, в какой форме, с использованием каких приёмов донести учебный языковой материал до сознания учеников? Как активизировать их познавательную деятельность? Как сформировать устойчивую мотивацию к учению, превратить знание в убеждения? Как добиться положительного отно-